# Значэнне паэтычных твораў у выхаванні асобы дашкольніка

Дашкольны ўзрост лічыцца найбольш спрыяльным перыядам мастацкага ўспрымання паэтычных твораў. У гады дзяцінства назіраецца асаблівае імкненне дзіцяці да рыфмаванага, рытмічна-арганізаванага складу маўлення. Дашкольнікі вельмі любяць слухаць і расказваць вершы. Яны аддаюць ім відавочную перавагу ў параўнанні з празаічнымі творамі.

Вершы беларускіх паэтаў і фальклор займаюць пачэснае месца ў агульнай сістэме духоўнага і мастацкага выхавання дашкольнікаў. Паэтычныя творы для дзяцей пашыраюць кругагляд дзіцяці, адкрываюць яму навакольны свет, дапамагаюць яму знайсці сваё месца ў гэтым свеце.

Маленькіх дзяцей цягне да дынамічных рытмаў, радаснай мелодыкі рыфмы. Яны без перапынку патрабуюць паўтараць кароткія, добра рытмізаваныя вершы з дакладнай, зразумелай і яскравай рыфмай. Мастацкае гучанне тэксту вершаванага твора захапляе дашкольніка, нараджае ў яго пэўныя пачуцці і вызывае адпаведны настрой. Па меркаванні, Ул. Глоцэра, " непасрэднасць і эмацыянальнасць дапамагае маленькаму чытачу (дакладней слухачу) правільна ўлаўліваць агульную танальнасць верша, яго настрой нават тады, калі ён не разумее значэнне многіх слоў ці адлюстроўваемых пэўных сітуацый. Там, дзе даросламу неабходна зразумець, каб атрымаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асалоду, маленькі слухач атрымлівае задавальненне непасрэдна ад гучання верша"[1]

1. Глоцер В. Дети пишут стихи. М., 1968. С. 45.

Вершы, з якімі выхавальнік знаёміць дашкольнікаў, вызначаюцца сваёй мастацкасцю, даступнасцю разуменню дзяцей, здольнасцю выклікаць у іх пэўныя эмоцыі. К. І. Чукоўскі падкрэсліваў, што верш павінен дастаўляць дзіцяці пэўную эстэтычную асалоду. Паэзія для маленькіх павінна быць і для дарослых паэзіяй.

У працэсе слухання паэтычных твораў у дашкольнікаў назіраецца асаблівая цікавасць да гучання мастацкага слова. Яны адчуваюць яго рытмічнасць, мілагучнасць, заўважаюць і паўтараюць вобразныя выразы, удалыя і трапныя параўнанні.

К. І. Чукоўскі сцвярджаў, што маленькія дзеці з вялікім задавальненнем імкнуцца да рытмічных словазлучэнняў, мілагучных вершаў, бадзёрага скандзіраванняня лічылак і заклічак.

Разам з выхаваннем мастацкасці і духоўнасці літаратурныя творы з'яўляюцца асноўным сродкам засваення дзецьмі роднай мовы.

Роля беларускай мастацкай літаратуры і фальклору павялічваецца ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму. Яна з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных сродкаў навучання рускамоўных дзяцей першапачатковым навыкам разумення беларускай мовы, узнаўлення пачутага, паступовага засваення мовы на прадуктыўным узроўні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ